# СУЗОР'Е ІНТЭРНАЦКІХ ТАЛЕНТАЎ

У інтэрнаце № 3 прайшоў штогадовы міжінтэрнацкі конкурс «Калейдаскоп талентаў». Студэнты з розных інтэрнатаў і факультэтаў дэманстравалі свае таленты, уражвалі сваёй індывідуальнасцю і неардынарнасцю. Усе яны пераможцы конкурсу талентаў у сваіх інтэрнатах, а гэта значыць, што за перамогу змагаліся лепшыя з лепшых.

Падтрымаць удзельнікаў прыйшлі іх сябры і знаёмыя, якія гучна апладзіравалі. Адказна «кіравалі парадам» вясёлыя і артыстычныя вядоўцы Ганна Хобатава (ФлФ) і Раўшан Паліванаў (ЮФ).

Першай выступіла Алена Зімніцкая (інтэрнат № 1), якая заваражыла ўсіх кампазіцыяй «Ave Maria» і ігрой на домры. Песняй «Ой-йо», выкананай пад гітару і губны гармонік, парадавалі прысутных Аляксандр Сабітаў і Станіслаў Алексіевіч (інтэрнат № 3). Танцавальны калектыў з інтэрната № 5 (Анастасія Мухіна, Кацярына Рабцэвіч, Таццяна Рубіна) прадставілі энергічны народны танец «Четыре двора». Чароўную песню пра каханне на сваёй роднай мове выканалі хлопцы з Туркменістана Арслан Чарыеў і Беглі Атаеў (інтэрнат № 6). Каміла Азымава (інтэрнат № 4) натхніла ўсіх сваім дынамічным арабскім танцам, а Анастасія Новікава з інтэрната № 3 – гарачай песняй «Shizgara».

Павесяліў гледачоў і тэатральны калектыў з інтэрната № 1. Ён прадставіў гумарыстычную музычную сцэнку «Как принцесса замуж собралась». Запомніўся таксама ўсім прысутным акрабатычны нумар танцавальна-спартыўнага гурта «Время вперед» з інтэрната № 5. Самабытным быў і народны танец студэнтаў са Шры-Ланкі (інтэрнат № 4). Апошняй выступіла Уладзіслава Чуракова (інтэрнат № 6), якая падрыхтавала сапраўднае фаер-шоу.

А пакуль члены журы раіліся, каму аддаць перамогу, вядоўцы займалі гледачоў цікавымі гульнямі, а танцавальныя гурты выступалі на біс.

І нарэшце доўгачаканы момант – узнагароджанне пераможцаў. Трэцяе месца заняў танцавальна-спартыўны калектыў «Время вперед», другое – тэатральны калектыў, першае – Уладзіслава Чуракова. Усе ўдзельнікі былі адзначаны дыпломамі «За актыўны ўдзел».

**Дзіяна ЛОСЬ, студэнтка 5 курса ФлФ.**







**Фота Арыны ГАЛЫНЯ, студэнткі 1 курса МГФ.**